Падтрымай "Вясну" на PATREON

“Хапун” перад Днём Волі працягваецца дапоўнена

25.03.2017 **Тэгі**: затрыманні



Узброены АМАП на вуліцах Мінска. Фота: tut.by

Уначы і раніцай, напярэдадні Дня Волі 25 сакавіка, у Беларусі працягваліся затрыманні грамадзянскіх актывістаў, палітыкаў і проста грамадзян, якія збіраліся патрапіць у Мінск на акцыю. Праваабаронцы вядуць спіс затрыманых і асуджаных.

Берасце, Уначы 25 сакавіка ў Брэсце затрыманы адзін з лідэраў Беларускага нацыянальнага кангрэсу **Уладзімір Някляеў.** Ён вяртаўся з Польшы цягніком у Мінск. У Варшаве палітык удзельнічаў у дыскусіі па сітуацыі ў Беларусі ў Семе Польшы. Чакалася, што Някляеў прыбудзе ўвечары ў беларускую сталіцу самалётам. У аэрапорце, па інфармацыі партала tut.by, яго чакалі амапаўцы і сілавікі ў цывільным. Гэтым рэйсам прыляцелі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Ганна Канапацкая і праваабаронца Алесь Бяляцкі. 23 сакавіка ў судзе Ленінскага раёна Мінска павінны былі разглядацца адміністрацыйныя справы Мікалая Статкевіча і Уладзіміра Някляева. Суддзя Дзмітрый Астапенка абвясціў пра захады

забеспячэння яўкі Міколы Статкевіча і Уладзіміра Някляева, паведаміў, што да яго прыходзілі міліцыянты, грукаліся ў дзверы, але ніхто не адчыніў. Суддзя пастанавіў адкласці паседжанне на 24 сакавіка. Някляеў знаходзіцца зараз у ІЧУ Ленінскага раёна.

Бабруйск. Да аднаго актывіста з прыйшлі з крымінальнага вышуку, распытвалі маці дзе ён і ці збіраўся ехаць у Менск. У кватэру маці не пускала, сказала што яго няма - зараз актывіст дома, міліцыя у падъездзе.

Бяроза. За 5 хвілін да адыходу цягніка на Менск на пероне быз затрыманы праваабаронца **Сяржук Русецкі**. На падыходзе да перону да яго пад'ехала міліцэйская машына, у якой сядзелі старэйшы лейтэнант і маёр, якія прапанавалі сесці ў машыну, дакументаў не прад'яўлялі, не прадстаўляліся, але машына з надпісам міліцыя і людзі ў форме. Зараз прывезлі ў РАУС Бярозаўскага раёна. Праваабаронца **Тамара Шчапёткіна** забрлакаваная ў кватэры супрацоўнікамі міліцыі.

Ваўкавыск. Актывіста **Віталя Гуляка** затрымалі ўначы на чыгуначным вакзале, гадзіну трымалі на вакзале, тры гадзіны ў РАУСе, потым завезлі дахаты, і пільнуюць, каб не выходзіў з дому.

Гарадок. У райцэнтры Гарадок затрыманы актывіст руху «За свабоду» **Леанід Гаравы**, які ехаў на сваім аўто ў Віцебск. Зараз ён знаходзіцца ў Гарадоцкім РАУС.

Ліда. Лідская міліцыя выправіла аўтамабіль у вёску, каб даставіць на размову ў райцэнтр мясцовага сябра Партыі БНФ **Сяргея Трафімчыка.**

Мінск. Увечары ў Мінску была затрыманая **Ганна Сівакова**, уначы яе даставілі ў Маскоўскі РУУС, дома адбыўся пратрус. У ноч з 24 на 25 сакавіка быў затрыманы актывіст анархісцкага руху **Раман Халілаў**.

Наваполацк. Уначы супрацоўнікі міліцыі затрымалі актывістку **Таццяну Ладукас.** За ёй доўга сачылі людзі ў цывільным. Нарэшце затрымалі і даставілі ў Наваполацкі ГАУС. Зараз яе павезлі ў Следчы камітэт Наваполацка.

Таксама затрыманы і актывіст БХК **Юрый Бельскі.** Ён артымаў позву з'явіцца ў Следчым камітэце, аднак не пайшоў. Раніцай стала вядома, што яго затрымалі, калі выходзіў з дому ехаць у Менск. Зараз у РАУС.

Полацк. Пасля ўчорашняга пратрусу ў полацкім офісе свабоднага прафсаюзу затрыманы актывіст **Віктар Стукаў**. Ён у Полацкім РАУСе.

Рэчыца. Раніцай затрымалі грамадскага актывіста **Алега Шабетніка** на чыгуначным вакзале. Вязуць у РАУС.

Непасрэдна з цягніка, які рухаўся ў Гомель, знялі рэчыцкага блогера **Дзмітрыя Лебедзева і Антона Варанцова**. Вязуць у Рэчыцкі РАУС.

Слонім. Раніцай, 25 сакавіка, каля ўласнай хаты ў Слоніме супрацоўнікі ДПС затрымалі сябра Слонімскага згуртавання дэмакратычных сіл **Уладзіміра Літвіна**. Калі Уладзімір запытаўся,за што яго затрымліваюць, супрацоўнікі ДПС сказалі, што за ўдзел у слонімскім “Маршы недармаедаў”. Маўляў, ім загадалі затрымаць і прывесці ў пастарунак. Цяпер Уладзімір Літвін знаходзіцца ў Слонімскім РАУСе.

Іван Бедка затрыманы на выхадзе з свайго пад'езду, яго завезлі ў РАУС - нібыта лаяўся матам. Грамадскія актывісты **Міхал Сошка і Алесь Масюк** фактычна заблакаваныя ў адным з дамоў, іх пільнуюць супрацоўнікі міліцыі.


У Слоніме яшчэ адзін затрыманы - актывіст БНФ **Павел Севасцьян** - яго ўжо тры гадзіны трымаюць у РАУСе.


Слуцк. Грамадзкая актывістка са Слуцка **Зінаіда Цімошак** паведаміла, што яна і яшчэ тры актывісты ехалі ў Менск на Дзень Волі, але іх машына была спыненая ДАІ і ўсіх павезьлі ў Слуцак, нібыта з-за таго, што машына была ў аварыі.

У **Чашніках** затрыманы актывіст **Пётр Ганчарэнка.** Ён паспеў напісаць сябру смс, у якім паведаміў, што міліцыя ўжо ў яго, ідзе пратрус.

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

